Источник: **«Голас Радзімы» - 2013-01-17**

## Навукоўца з фантазіямі



**Даследчык літаратуры Уладзімір Гніламёдаў не толькі аналізуе чужыя творы, але і сам піша раманы**

Таленавітых творцаў, што напоўніцу скарыстоўвалі ў сваёй дзейнасці як аналітычны розум вучонага, так і мастацкае ўяўленне пісьменніка, няшмат. Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Іван Навуменка, Алег Лойка… Нямногія з майстроў слова ўшанаваны званнем акадэмікаў. Таму і цікавы на гэтым літаратурна-навуковым памежжы феномен Уладзіміра Гніламёдава. Яго на імпрэзе з нагоды 75-х угодкаў выступоўцы называлі “адным з правафланговых крытычнага цэха ў сучаснай беларускай літаратуры”. Згадвалі, што сялянскі сын з вёскі Кругель Камянецкага раёна Брэстчыны здолеў у свой час з гонарам прайсці праз жорны чыноўніцкай работы — і не счарсцвець сэрцам.

Сябры, калегі як з Акадэміі, так і па пісьменніцкім саюзе, што віншавалі юбіляра ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі, дзівіліся яго працаздольнасці. Сярод творчых здабыткаў акадэміка — 300 літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, 11 манаграфій, дапаможнікі, брашуры. На выставе “Чалавек — сукупнасць свайго мінулага...”, што зладзілі да юбілею акадэміка супрацоўнікі бібліятэкі, былі яго асноўныя творы. Сярод экспанатаў — раманы “Уліс з Прускі”, “Расія”, “Вяртанне”, “Валошкі на мяжы”, “Людзі і ўчынкі”, манаграфіі, кнігі крытыкі. Заслугоўваюць увагі напісаныя ім творчыя партрэты класікаў літаратуры, пісьменнікаў сучаснасці: “Іван Мележ”, “Праўда зерня: творчы партрэт Васіля Зуёнка”, “Янка Купала: новы пагляд”. Даследаванне “Янка Купала: жыццё і творчасць” пабачыла свет да 130-х угодкаў Песняра.

Як вучонага Уладзіміра Гніламёдава шмат што цікавіць: ад гісторыі літаратуры да яе тэорыі, метадалогіі, мастацкай крытыкі. Ён грунтоўна даследуе беларускую літаратуру XX стагоддзя, лічыць яе “адной з найважнейшых формаў нацыянальнай духоўна-эстэтычнай свядомасці”. А колькі назіранняў у яго за тым, як ідзе літпрацэс, як сталелі ў творчасці мэтры слова. А як успрымае акадэмік паўсядзённасць? Пра тое можна пачытаць у кнізе “Уладзімір Гніламёдаў: “Заставацца сабой...” , што выйшла летась.

**Іван Ждановіч**

На здымку:
**Уладзімір Гніламёдаў (у цэнтры) і яго сябры-пісьменнікі (злева направа) Уладзімір Ліпскі, Зоя Падліпская, Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, Мікола Мятліцкі**